*Юлія Кучвальская*

## Калядная традыцыя Заходняга Палесся і асаблівасці яе вывучэння ў працах даследчыкаў

Паводле этнакультурных прыкмет на тэрыторыі Беларусі вызначаецца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, сярод якіх вылучаецца Заходняе Палессе [15, с. 153]. Даследчыкі адзначаюць, што для Брэсцкага Палесся характэрны «шырокае распаўсюджанне і добрая захаванасць каляднага комплексу, які мае тут шэраг асаблівасцей» [14, с. 26]. Публікацыі, прысвечаныя каляднай традыцыі насельніцтва Заходняга Палесся, з'яўляюцца ў ХІХ ст. Разгледзім працы, якія сталі вызначальнымі для фарміравання гэтага кірунку даследаванняў.

Адна з першых прац, у якой прыводзяцца звесткі аб абрадзе калядавання і адпаведныя песні, – «Pieśni ludu Biało-Chrobatów, Mazurów i Rusi znad Bugu ...» (1836 г.) К.Ул. Вуйціцкага. Тут *«kolędy»* – песні, якія выконваюцца хлопчыкамі падчас абходу двароў пад вокнамі альбо дзвярыма хаты. У падраздзеле «Z osad Ruskich podlasia» прадстаўлены беларускія калядныя песні, запісаныя ў аколіцах Бельска [20, с. 212-216].

У кнізе Р. Зянькевіча «Piosenki gminne ludu Pińskiego» (1851 г.) змешчана 15 калядных песень і даецца кароткае апісанне каляднага абходу з казой. Прыведзеныя матэрыялы зафіксаваныя над Пінай, Прыпяццю і Цной [22, с. 1-45]. У другой працы Р. Зянькевіча «O uroczyskach i zwyczajach ludu pińskiego, oraz o charakterze jego pieśni» (1852 г.) у падраздзеле «Zwyczaj Kolendowy» асноўная ўвага надаецца апісанню звычаяў напярэдадні Новага года. Паводле даследчыка, напярэдадні Новага года сяляне хадзілі з каляднымі віншаваннямі па вёсцы, папулярнымі былі таксама звычай *«uczeniu ostrożności»* – спецыяльнае жартоўнае выкраданне рэчаў у аднавяскоўцаў і калядная варажба. Перыяд ад Раства Хрыстова да Вадохрышча называўся «Святымі вечарамі» [21, с. 513-517].

У другой палове ХІХ ст. з'яўляецца «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае» (1866 г.) П.А. Гільтэбранта, у якім былі апублікаваны дзве калядкі з Брэсцкага павета [6, с. 165-166]. У прадмове да выдання аўтар коратка апісаў абрады «калядавання» і «шчадравання» і адзначыў, што калядоўшчыкі пры абходзе двароў спяваюць калядныя песні, услаўляюць членаў сям'і, жадаюць ім дабрабыту: *«На новое літо // Роды, Боже, жито, //Жито, пшэницю, // Горохь, сачевыцю, // Вь клюни умолутно, //Вь дижцы зыхудно»* [6, с. ХСIII].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

П.А. Бяссонаў у зборніку «Белорусские песни...» (1871 г.) у раздзеле «Колядки, Песни Колядны; Коляды, Коляда» прыводзіць дзевяць тэкстаў калядных песень, запісаных на Піншчыне [2, с. 72-79]. Для большасці з іх характэрны наступныя прыпевы: *«Радуйся, радовалися да вси святыя Рожеством!», «Святы вечор, свят!», «Славён Бог наш на небесах!».* Такія песні аўтар адносіць да хрысціянскага часу, аднак пазначае, што па меры напаўнення хрысціянскімі *«вставками»* і *«образами»* калядныя песні пераходзяць у духоўныя *«стихи»* [2, с. 78].

Тэксты каляднага святочнага рэпертуару, зафіксаваныя ў Пінскім і Кобрынскім паветах, прадстаўлены ў трэцім томе «Трудов этнографнческо-статистической экспедиции в Западно-Русский край...» (1872 г.) П.П. Чубінскага. У дадзеных тэкстах прысутнічаюць хрысціянскія матывы: *«А на дорогу, господар ходить // К собі Господа на вечеру просить...», «По твойму полю сам Господь ходить // Сам Господь ходить, три свяці водить...»,* услаўляюцца ўсе члены сям’і, гаспадарская хата: *«...Що жь місячикь – то господарикь, // Що сонечко – то господинька, // Ясниі зірки – то ёго дітки...»* [16, с. 262-482].

Ю.Ф. Крачкоўскі ў выданне «Быт западно-русского селянина» (1874 г.) уключае этнаграфічныя матэрыялы па каляднай абраднасці, у асноўным з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Апісваючы калядныя святкаванні, аўтар адзначае некаторыя асаблівасці свята, характэрныя для сялян Кобрынскага павета, прыводзіць некалькі калядак з Брэсцкага павета [9, с. 167-171].

Зборнік «Пинчуки» (1890 г.) Дз.Г. Булгакоўскога прысвечаны традыцыйнай духоўнай культуры Піншчыны. Значнае месца ў ім адводзіцца песеннаму рэпертуару: апублікаваны 22 калядкі і 12 шчадровак у раздзеле «Песни» [3, с. 24-51]. Характарыстыку калядным і шчадроўскім песням аўтар дае ў раздзеле «Характеристика песен по их содержанию». Калядныя песні ён падзяляе наступным чынам: Богу, гаспадару хаты, хлопцам, дзяўчатам, бабе і валу. У песнях *Богу* згадваюцца падзеі з жыцця Хрыста і Маці Божай, у песнях *гаспадару хаты* – хлебныя палі і г. д. Каштоўнымі з’яўляюцца прыклады рэчытатыўных формул, якія Дз.Г. Булгакоўскі прыводзіць разам з песнямі. Л.М. Вінаградава адзначае, што такія рэчытатыўныя формулы непарыўна звязаны з песенным рэпертуарам, якія можна разглядаць як «прамежнае звяно ў складанай сістэме адносін: рытуал – абрадавы прыгавор – абрадавая песня» [5, с. 7].

Калядныя песні прадстаўлены ў зборніку М. Доўнар-Запольскага «Песни пинчуков» (1895 г.). Тэксты святочных песень, апублікаваныя ў падраздзеле «III. Колядки и щедровки», запісаны ў наступных населеных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пунктах: Дабраслаўка, м. Целяханы, Выганішчы, Святая Воля, Плотніца [7, с. 40-47].

У фальклорна-этнаграфічную калекцыю О. Кольберга ўвайшлі матэрыялы з тэрыторыі Заходняга Палесся. Яны апублікаваны ў 52 томе «Białoruś-Polesie» (1968 г.) [19]. Аднак новых звестак аб каляднай абраднасці няма, прыводзяцца запісы, раней апублікаваныя Р. Зянькевічам у працах «Piosenki gminne ludu Pińskiego» (1851 г.), «O uroczyskach i zwyczajach ludu pińskiego, oraz o charakterze jego pieśni» (т. 4, 1852 г., т. 1, 1853 г.).

Такім чынам, у працах этнографаў і фалькларыстаў XIX ст. звесткі аб каляднай абраднасці беларусаў Заходняга Палесся адлюстраваны часткова, апісаны толькі асобныя элементы каляднага абрадавага комплексу. У большай ступені даследчыкамі прадстаўлены песенны рэпертуар святочнага цыкла. Калядная традыцыя ў дадзеным рэгіёне заставалася не дастаткова вывучанай.

У пачатку XX ст. з'яўляецца «Сборник народных песен, записанных в поселке Калюга-Комарно, Рогознянской волости, Кобринского уезда, Гродненской губерни» (1911 г.) І.Е. Бычко-Машко, у якім змешчана адна калядная песня: *«...Себ твий ячмінь уродився; // Себ нажяли сто кип жита, // Себ симья була вся сита, // Себ скотинка водилася, // Себ пшиниця родилася...»* [4, с. 59].

У зборніку Е.Р. Раманава «Материалы по этнографии Гродненской губерии» (1911 г.) у раздзеле «Песни обрядовые» коратка падаецца звычай хаджэння са «звяздой» і апісваецца канструкцыя каляднай зоркі. Гаворыцца, што ў Брэсцкім павеце, пачынаючы з першага дня Раства Хрыстова і да Хрышчэння, хлопчыкі абходзілі двары са «звяздой», пры гэтым песні яны выконвалі ў асноўным з *«Богогласника».* Аналагічныя дзеянні зафіксаваны ў Кобрынскім павеце. Е.Р. Раманаў адзначаў рэлігійнасць беларускага сялянства, якое ў «вышэйшай ступені прыхільна да храма Божага» [12, с. 52].

Новыя працы па дадзенай праблематыцы пачалі з'яўляцца ў пасляваенныя гады.

Значную збіральніцкую працу ў Заходніх рэгіёнах Беларусі правёў Р.Р. Шырма, што стала падставай для выдання асобных зборнікаў. Так, у першым томе народнай паэзіі «Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі» (1947 г.) апублікаваны тэкст адной шчадроўкі, запісаны, паводле Р.Р. Шырмы, «у Хомску на Піншчыне» [18, с. 214]. У зборніку «Двести белорусских народных песен» (1958 г.) змешчаны чатыры калядкі, зафіксаваныя ў Пружанскім раёне [17, с. 64-74].

Традыцыйнаму фальклору Брэсцкай вобласці прысвечаны першы выпуск серыйнага выдання «Беларускі фальклор у сучасных запісах» (1973 г.)

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– першага сістэматычнага навуковага зводу фальклорных запісаў дадзенага рэгіёну. У раздзеле «Каляндарна-абрадавая паэзія» прыводзяцца звесткі аб каляднай абраднасці і адпаведныя песні [1, с. 51-56, 65-73].

Л.М. Вінаградава ў працы «Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян» (1982 г.) змясціла праграму для збірання фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу па святочнаму цыклу абрадаў спецыяльна для экспедыцыйнай працы ў Палессі [5, с. 246-252], а таксама аналіз матэрыялаў, атрыманых у выніку палявога даследавання.

Этнамузыколаг З.Я. Мажэйка ў сваёй працы «Песни белорусского Полесья» (1983 г.) даследуе калядныя песні. Аўтар вывучае песенна-меладычныя тыпы калядных напеваў. Каштоўнымі з'яўляюцца прыведзеныя ў раздзеле «Календарно-земледельческий цикл» уласныя тэксты калядных песень беларусаў Заходняга Палесся [10, с. 24-53].

Ф.Д. Клімчук матэрыялы аб каляднай абраднасці в. Сіманавічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці прадставіў у зборніку «Славянский и балканский фольклор» (1995 г.) [8, с. 347-350].

У.І. Раговіч у выданні «Песенны фальклор Палесся» (т. 1, 2001 г.) змясціў песні святочнага календара. У раздзеле «Зімовыя песні» аўтар прывёў 63 калядныя песні, запісаныя ад фальклорных гуртоў з Іванаўскага, Кобрынскага, Ляхавіцкага, Маларыцкага і Пінскага раёнаў [11, с. 401-490].

У кнізе «Полесскнй народный календарь» (2005 г.) С.М. Талстой прадстаўлены матэрыялы палявых даследаванняў каляднай традыцыі [13, с. 117-125, 208-210].

Матэрыялы па каляднай абраднасці, якія даюць уяўленне аб асаблівасцях правядзення калядных святкаванняў на тэрыторыі Брэсцкага Палесся, увайшлі ў першую кнігу чацвёртага тома «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2008 г.) [14, с. 33-64]. У раздзеле «Песні зімы» апублікаваны калядныя песні з розных рэгіёнаў Брэсцкага Палесся [14, с. 68-93].

Такім чынам, даследаванне каляднай традыцыі Заходняга Палесся пачынаецца з XIX ст. У разгледжаных навуковых працах у большасці сваёй прадстаўлены песенны рэпертуар святочнага цыкла.

Комплекснага даследавання, прысвечанага каляднай традыцыі Заходняга Палесся, на сёння няма. Не выяўлена ў належнай ступені спецыфіка каляднай абраднасці ў духоўнай культуры Заходняга Палесся. Таму дадзеная праблематыка патрабуе больш сістэматычнага навуковага аналізу.

**Спіс літаратуры:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры / склад. В. А. Захарава. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1973. – 304 с.
2. Бессонов, П. А. Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П. А. Бессонов. – М. : В Типографии Бахметева, 1871. – 176 с.
3. Булгаковский, Д. Г. Пинчуки: песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверия и местный словарь / Д. Г. Булгаковский ; под ред. Ф. Истомина. – СПб. : В Типографии В. Безобразова и Комп., 1890. – 200 с.
4. Бычко-Машко, И. Е. Сборник народных песен, записанных в поселке Калюга-Комарно, Рогознянской волости, Кобринского уезда, Гродненской губерни / И. Е. Бычко-Машко. – СПб. : Типография Императорской Академии наук, 1911. – 61 с.
5. Виноградова, Л. Н. Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян: Генезис и типология колядования / Л. Н. Виноградова. – М. : Наука, 1982. – 256 с.
6. Гильтебрандт, П. А. Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае / П. А. Гильтебрандт. – Вильна : Издание редакции «Виленского вестника», 1866. – 294 с.
7. Довнар-Запольский, М. Песни пинчуков: с приложением карты северной части уезда и статьи о говоре / М. Довнар-Запольский. – Киев : Типография Императорского университета Св. Владимира В. И. Завадзкого, 1895. – 203 с.
8. Климчук, Ф. Д. Духовная культура полесского села Симоновичи / Ф. Д. Климчук // Славянский и балканский фольклор. – М. : Издательство «Индрик», 1995. – С. 335 – 380.
9. Крачковский, Ю. Ф. Быт западно-русского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – М. : В Университетской типографии, 1874. – 212 с.
10. Можейко, З. Я. Песни белорусского Полесья : в 2 вып. / З. Я. Можейко. – М. : Советский композитор, 1983-1984. – Вып. 1. – 1983. – 183 с.
11. Раговіч, У. І. Песенны фальклор Палесся : у 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Выд-ва «Чатыры чвэрці», 2001. – Т. 1. Песні святочнага календара. – 527 с.
12. Романов, Е. Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии : в 2 вып. / Е. Р. Романов. – Вильна : Типография «Русский почин», 1911-1912. – Вып. 1. – 1911. – 237 с.
13. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М. : Индрик, 2005. – 599 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001-2013. – Т. 4. Брэсцкае Палессе : у 2 кн. / В.І. Басько [і інш.]. – 2008. – Кн. 1. – 559 с.
15. Цітоў, В. С. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён / В. С. Цітоў // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал. : І. П. Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 153.
16. Чубинский, П. П. Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край, снаряжѐнной Императорским русским географическим обществом. Юго-Западный отдел. Материалы и исследования : в 7 т. / П. П. Чубинский. – СПб., 1872-1878. – Т. 3. Народный дневник. – 1872. – 486 с.
17. Ширма, Г. Р. Двести белорусских народных песен / Г. Р. Ширма ; под общ. ред. С. В. Аксюка. – М. : Совет. композитор, 1958. – 274 с.
18. Шырма, Р. Р. Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі / Р. Р. Шырма. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1947. – Т. 1. – 219 с.
19. Kolberg, O. Dzieła wszystkie : 84 t. / O. Kolberg. – Wrocław–Poznań–Warszawa, 1961-2002 – T. 52. Białorus-Polesie / z rękopisów opracowali Stanisław Kasperczak, Aleksander Pawlak. – 1968. – 572 s.
20. Wójcicki, K. W. Pieśni ludu Biało-Chrobatów, Mazurów i Rusi znad Bugu, z dołączeniem odpowiednich pieśni ruskich, serbskich, czeskich i słowiańskich: ozdobione rycinami i muzyką :  2 t. / K. W. Wójcicki. – Warszawa : W Drukarni Piotra Baryckiego, 1836. – T. 1. – 343 s.
21. Zieńkiewicz, R. O uroczyskach i zwyczajach ludu pińskiego, oraz o charakterze jego pieśni / R. Zieńkiewicz // Biblioteka Warszawska. – Warszawa : W Drukarni Stanislawa Strąbskiego, 1852. – T. 4. – S. 502 – 527.
22. Zieńkiewicz, R. Piosenki gminne ludu Pińskiego / R. Zieńkiewicz. – Kowno, 1851. – 415 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ